36669
ЗИП 2 (47.60)
К 85
ДУБЛЕТНЫ ФОНД
Урадавай бібліятэкі
імя Горкага
Аддзел ..... № 36669

А. КРЫНІЦКІ

# АБ ВЫНІКАХ XV-ай КАНФЭРЭНЦЫІ УсеКП(б)

Н.Ф.
ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

ВЫДАНЬНЕ ГАЗЭТЫ
„САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ“ орган ЦВК БССР
МЕНСК—1926

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА
РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

ЗжП2 (47.60)
К 85
Інв. 348972
Дзяржаўная бібліятэка ... Горкага

*Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!*

# АБ ВЫНІКАХ XV-ай КАНФЭРЭНЦЫІ ЎсеКП(б).

## Даклад тав. Крыніцкага на актыве Менскай Гарадзкой Партарганізацыі—9 лістапада 1926 году.

### I. Характар бягучага моманту.

Т. т., я думаю, што ітогі XV-й канфэрэнцыі ЎсеКП кожная партыйная арганізацыя, кожны камуніст у поўнай меры змогуць ацаніць толькі тады, калі будуць прапрацованы ўсе матар'ялы XV-й канфэрэнцыі. А таму я спынюся толькі на вузлавых момантах у рабоце XV-й канфэрэнцыі.

«Канфэрэнцыя працавала і вынесла свае рашэньні ў адзін з адказьнейшых момантаў гісторыі партыі і гісторыі нашай рэвалюцыі, нашага будаўніцтва. Па-за XV-й канфэрэнцыяй засталася вагромністая паласа «аднаўленчага» пэрыяду. Канфэрэнцыя працавала на пераходзе да новага пэрыяду. Канфэрэнцыя выпрацавала дырэктывы для працы ў новых умовах перабудаваньня ўсёй гаспадаркі на больш высокай вытворча-тэхнічнай аснове. Канфэрэнцыя канкрэтызавала практычныя шляхі ажыцьцяўленьня індустрыялізацыі».

Асноўныя ітогі гэтага аднаўленчага пэрыяду, факты і лічбы вы ведаеце,—а таму на гэтай частцы я доўга не затрымліваюся.

За аднаўленчы пэрыяд наша прамысловасьць разьвілася з тэмпам, якога зусім ня ведаюць капіталістычныя краіны. 1924-25 год, напрыклад, даў рост прамысловасьці на 60 проц. у параўнаньні з папярэднім годам. Наша прамысловасьць дзьвінулася наперад далёка хутчэй, чым сельская гас-



Прэзідэнцкая бібліятэка Рэспублікі Беларусь

падарка. Пры гэтым найбольш хуткі тэмп набыў рост вырабу сродкаў вытворчасьці. Агульнаму росту адпавядаў агульны рост заработнай платы, паступовае палепшаньне матар'яльнага становішча рабочых. Мы закончылі аднаўленчы пэрыяд з цьвёрдай валютай, пераджыўшы за апошні год вельмі шмат цяжкасьцяй. Тое, што ў новы пэрыяд рэканструкцыі гаспадаркі мы ўступаем з цьвёрдай валютай,—гэта адно з буйнейшых дасягненьняў. Калі паставіць пытаньне,—пры ўсім росьце па якому руслу разьвівалася наша гаспадарка, то ўсе даныя адказваюць, што грамадзкія і сацыялістычныя элемэнты разьвіваліся у нашай гаспадарцы адносна хутчэй і яны займаюць з году ў год усё большае адноснае значэньне.

Пры ўсіх дасягненьнях, аднак, трэба падкрэсьліць адну асноўную рысу, якая характарызуе наступны пэрыяд,—гэта тое, што зараз наш рост **ня зможа пайсьці так хутка, як ён ішоў у апошнія гады.** Калі разьвіцьцё прамысловасьці ў агульным сэктары дзяржаўнай гаспадаркі ішло, галоўным чынам, па лініі разьвіцьця і ўзмацненьня **зваротнага** капіталу, то зараз мы ўступаем у паласу, калі гэта накапленьне пойдзе, галоўным чынам, па лініі пашырэньня і павялічэньня **асноўнага** капіталу. Калі раней уклады ў прамысловасьць давалі значна хуткі эфэкт, калі мы павялічваючы фонд заработнай платы, павялічваючы лік рабочай сілы, у той-жа год мелі ў выніку дадатковую прадукцыю, калі таксама было з сыр'ём і г. д.,—то зараз ужо ўклады ў прамысловасьць пойдуць раней усяго на капітальнае будаўніцтва, г. з. дадуць выразны вынік прыкладам праз 3—4 гады, а інагды і больш. Ня гледзячы на тое, што затраты на прамысловасьць мы будзем праводзіць усё больш, ня гледзячы на гэта ня будзем бачыць у працягу некалькіх бліжэйшых год у тэй-жа меры выяўнага для кожнага селяніна і рабочага эфэкту, які падае на кожны рубель затраты. А таму выяўны тэмп нашага росту—у выглядзе колькасьці прамысло-

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

вай прадукцыі—у бліжэйшыя гады будзе значна цішэй тэмпу апошніх год, ня гледзячы на агульнае ўзмацненьне, ня гледзячы на тое, што мы прыступілі да перабудовы па сацыялістычнаму шляху ўсёй нашай гаспадаркі, ня гледзячы на тое, што тэмп нашага росту будзе далёка значней тэмпу росту любой капіталістычнай дзяржавы.

Вось чаму нязьбежна напружанасьць балянсу між горадам і вёскай; іншымі словамі—значны таварны голад, няхват прадуктаў прамысловасьці адпаведна з патрэбамі будзе адчувацца ў бліжэйшыя гады іменна таму, што выжыцьцё дыспрапорцыі прамысловасьці і сельскай гаспадаркі, выжыцьцё таварнага голаду магчыма больш ціхім шляхам—не за кошт узмацненьня зваротнага капіталу, а за кошт вялізарных капітальных затрат, вынікі якіх ня прыдуць у той-жа самы год. Больш ціхім ростам прамысловасьці будзе адзначацца бліжэйшы пэрыяд; гэта абставіна створыць шмат цяжкасьцяй, што ўжо ў апошні год адчуваліся і паслужылі ў прыватнасьці глебай для значнай часткі плятформы «новай апазіцыі». З гэтымі цяжкасьцямі, паўтараю, нам прыйдзецца вельмі лічыцца; яны нададуць асобую афарбоўку складанасьці работы ўсяму наступнаму пэрыяду, ня гледзячы ў агуле на пераможнасьць сацыялістычнага будаўніцтва, ня гледзячы на пабеды, крок за крокам ва ўзмацненьні дзяржаўнага сэктару ў эканоміцы нашай краіны.

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Адначасова трэба адказаць на пытаньне: што будзе адбывацца з прыватным капіталам у працэсе гэтага росту? Відавочна, што ён у абсалютных разьмерах будзе расьці; але нясумненна, што яго адноснае значэньне будзе падаць так-жа, як яно падала за ўсе апошнія гады. Вы ведаеце даныя аб падзеньні прыватнага капіталу і па лініі прамысловасьці, і опту, і розьніцы ў таваразвароце.

У такіх абставінах перад партыяй, перад усёй краінай ставіцца рад агульных задач, і XV-я Канфэрэнцыя ЎсеКП гэтымі задачамі займалася. Ад-

ным з важнейшых пытаньняў эканамічнага будаўніцтва ставіцца пытаньне аб крыніцах накапленьня для справы індустрыялізацыі. Рашэньні XV-й Канфэрэнцыі даюць адказ на гэта пытаньне: за кошт самой прамысловасьці, за кошт бюджэту (пераразьмеркаваньне нацыянальнага прыбытку праз бюджэт), за кошт выкарыстаньня зьберажэньняў самога насяленьня. Дастарчальны тэмп накапленьня і ўкладу сродкаў у справу індустрыялізацыі будзе **азначаючым** момантам ва ўсёй нашай гаспадарчай рабоце на бліжэйшы пэрыяд. У гэтым пытаньні аб крыніцах накапленьня будуць і найбольшыя цяжкасьці: іменна ў гэтым пытаньні будуць скрыжоўвацца ўсе праблемы ўзаемаадносін рабочае клясы і сялянства. Якім тэмпам накапляць, за кошт каго накапляць,—усе гэтыя пытаньні ўпіраюцца ў канчатковым рахунку ў больш агульнае пытаньне—узаемаадносін рабочае клясы з сялянствам.

У сувязі з новым характарам пэрыяду, у які мы ўступаем, наша дзяржава, наша партыя павінны перагледзець усю практыку і сыстэму кіраваньня нашай прамысловасьцю, работу ўсіх нашых апаратаў і гаспадарчых органаў. Гэта пытаньне стала перад намі зараз таксама, як новае. Той гаспадарчы апарат, з якім мы маем справу зараз, сфармаваўся ў старых умовах, на задачах, за каторыя мы ўзяліся ў пачатку НЭП'у, сфармаваўся ў той пэрыяд, калі задачы аднаўленьня былі галоўнейшымі. Калі мы зараз завастраем задачы рэканструкцыі, рацыяналізацыі ўсяго будаўніцтва, задачы правядзеньня рэжыму эканоміі ва ўсіх галінах, дабіваемся найбольш пасьлядоўнага ажыцьцяўленьня лініі партыі праз усе апараты, калі ва ўвесь рост перад намі паўстала зараз пытаньне барацьбы з бюрократызмам, то зусім ясна, што пытаньне аб сыстэме кіраўніцтва набывае надзвычайна вялікае значэньне. Гэта датычыцца, зразумела, ня толькі прамысловасьці, а таксама сельскай гаспадаркі.

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Пытаньне індустрыялізацыі нашай гаспадаркі ставіцца ў цеснай сувязі з пытаньнямі росту і разьвіцьця сельскай гаспадаркі. Сапраўды, мы вырашаем задачу індустрыялізацыі ня толькі ў тым сэнсе, што ў нашых прамысловых раёнах, у першую чаргу, разьвіваем буйную прамысловасьць і, у першую чаргу, выраб сродкаў вытворчасьці.

Аднак, нельга ўяўляць задачу індустрыялізацыі і так, што ў кожным раёне, у кожнай вёсцы абавязкова будуецца фабрыка ці завод: гэту задачу індустрыялізацыі мы разумеем, як агульнае ўзмацненьне ва ўсёй нашай гаспадарцы ўдзельнага значэньня буйнай прамысловасьці, у першую чаргу, прамысловасьці, якая выробляе сродкі вытворчасьці, і ў той-жа час з разуменьнем індустрыялізацыі мы зьвязваем сустрэчны працэс «зьнізу» з боку сялянскай гаспадаркі, у якой ідзе агульны рост, працэс інтэнсыфікацыі, ідзе ўсё ўзрастаючая вытворчасьць сырця патрэбнага для нашай прамысловасьці; на грунце гэтага росту разьвіваецца прамысловасьць (і вытворчая каапэрацыя) па перапрацоўцы прадукцыі сельскае гаспадаркі, і ў той-жа час усякімі шляхамі разьвіваецца працэс «абабшчэстваленьне», каапэраваньня гаспадарак.

Калі мы гаворым аб індустрыялізацыі, мы ня можам у поўнай меры гэту задачу перанесьці на цэлы рад раёнаў нашай краіны, у прыватнасьці, на БССР. Мы ў БССР, напрыклад, зусім ня можам ставіць у бліжэйшы пэрыяд задачу разьвіцьця буйнай індустрыі, якая выробляе сродкі вытворчасьці. Наша прамысловасьць будзе ці ня буйная мэталічная прамысловасьць (сельска-гаспадарчыя машыны), ці прамысловасьць на мясцовай сыравіне, ці мясцовая прамысловасьць, якая перапрацоўвае прадукты сельскай гаспадаркі. Галоўным чынам, гэта будзе сярэдняя і дробная прамысловасьць. Наша работа па разьвіцьцю элемэнтаў грамадзкасьці ў сельскай гаспадарцы, па разьвіцьцю зьвязанай непасрэдна з сельскай гаспадаркай—гэта вырашэньне другога боку задачы індустрыяліза-

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

цыі краіны. І калі зараз уся партыя працуе пад лёзунгам ажыцьцяўленьня, ставіць практычна пытаньне аб індустрыялізацыі, мы ў гэткім раёне, як у Беларусі, пераважна сялянскай рэспубліцы— гэту-ж самую задачу ставім так, як гэта можна ставіць з боку сялянскага раёну, галоўным чынам, пад пунктам погляду падцягваньня сельскай гаспадаркі да буйнай прамысловасьці, яе інтэнсыфікацыі, яе росту па шляху разьвіцьця элемэнтаў «аbabшчэствлённых».

Агульныя задачы, з якіх я некаторыя пералічыў, таксама характарызуюць нашы гаспадарчыя абставіны, у якіх працавала і вынесла свае рашэньні Канфэрэнцыя.

## II. „Эканамічная пляцформа“ апазіцыйнага блёку.

Трэба сябе запытаць: апазыцыйны блёк у партыі, які нарабіў так шмат гвалту, які спрабаваў навязаць партыі дыскусію,—гэты апазыцыйны блёк даў партыі што-небудзь новае на XV-й Канфэрэнцыі? Ні слова. Вы гэта ведаеце з газэт. На канфэрэнцыі апазыцыя ні гуку ня выказала па пытаньнях агульна-гаспадарчага становішча, па пытаньнях нашых чарговых задач. Тут апазыцыя заблыталася. Адзін з лідэраў казаў, што «яны-ж хочуць да мінімума зьменшыць свае выступленьні на канфэрэнцыі, каб не даваць повaду тлумачыць іх, як працяг фракцыйнае працы». Здавалася-б, калі апазыцыя затрымалася на некім «мінімуму», дык гэты «мінімум» павінен быў-бы ў першую чаргу ахапіць найбольш жыцьцёвыя пытаньні для ўсяе партыі і краю, пытаньні найбольш актуальныя,—пытаньні гаспадарчага будаўніцтва. Апазыцыя-ж тут маўчала, апазыцыя свае выступленьні згуртавала на апошнім пытаньні аб унутры-партыйным становішчы, зусім прамінуўшы пытаньні гаспадарчага будаўніцтва. Але мы ведаем з усіх ранейшых выступленьняў апазыцыі яе эканамічную пляцформу,

Прэзідэнцкая бібліятэка Рэспублікі Беларусь

складзеную з кавалачкаў, якія даводзіцца прызнаць у некаторых частках супярэчнымі. Гэта апазыцыйная эканамічная пляцформа прыблізна такая. У рашаючым пытаньні—пра цэны—гэта пляцформа скіроўваецца на **павялічэньне адпускных цэн.** Вы ведаеце, што адзін з прыхільнікаў апазіцыі Майзлін падлічваў, што пры павялічэньні гэтых цэн, прыблізна на 30 проц. (аптовых цэн, зразумела), мы ня будзем мець павялічэньня розьнічных цэн, але выйграем нават цэлы міліярд, які здолеем укласьці ў прамысловасьць. Вы ведаеце прапанову аб павялічэньні цэн з выступленьняў Пятакова яшчэ на ліпнёўскім пленуме, калі т. Дзяржынскі разьбіў яго па ўсіх пунктах. Гэтую практычную прапанову апазыцыі трэба лічыць адною з важнейшых, бо палітыка цэн вызначае ў першую чаргу суадносіны рабочае клясы і сялянства, прамысловасьці і сельскай гаспадаркі, пралетарскай дзяржавы і сялянства і наогул, шырокіх працоўных мас. Гэтае пытаньне сапраўды самае важнае. На XV-ай Канфэрэнцыі апазыцыя «абміна́вала» гэтую сваю прапанову. Выявілася поўная беспадстаўнасьць прапановы: павялічэньне адпускных цэн, гэта значыць, павялічэньне розьнічных цэн, гэта значыць, ваганьне валюты, гэта значыць, зьніжэньне рэальнага заработку і пагоршаньне становішча сялянства. Гэта значыць, рух назад па ўсіх напрамках нашага гаспадарчага будаўніцтва.

Другі пункт—падатковая палітыка, якая прапануе вызваліць 40 проц. беднаты ад падатку і ўскласьці большы падатковы цяжар на верхнія гушчы сялянства. Вы чыталі ў дакладзе т. Рыкова, да чаго магло-б прывесьці такое, прыблізна, падвойнае ападаткаваньне вышэйшых груп сялянства. Калі ўзьнімаць пытаньне аб значным павялічэньні ў бюджэце гэтае прыбытковае часткі, дык гэта азначала-б адабраньне ад сялянскага прыбытку ўжо не 30-ці проц., а 50-ці, а можа і больш; гэта вялікае адабраньне дадавалася-б да пераплат селяніна ў параўнаньні з даваенным каэфіцыэнтам

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

З-за высокіх розьнічных цэн. Інакш кажучы, такі вялікі падатак стварыў-бы сялянскай гаспадарцы вельмі цяжкае становішча. І закранула-б гэтае цяжкае павялічэньне ня 2—3 проц. гаспадарак, а, пераважна, вялікую гаспадарча моцную гушчу серадняцкіх гаспадарак, ня кулацкую, не эксплёататарскую, а серадняцкую гаспадарку, асноўны гаспадарчы серадняцкі асяродак, серадняцкую масу вёскі. Такая падатковая палітыка цалкам супярэчыць асноўнаму напрамку партыі ў сялянскім пытаньні.

Трэці момант—пытаньне аб беднаце. Таварышы ведаюць усе прапановы апазыцыі ў гэтай галіне з папярэдняга абмеркаваньня пытаньня ў партыі. Апазыцыя лічыла яшчэ на ліпнёўскім пленуме, што партыя мала праводзіць працы сярод беднаты. Як мы адказвалі? Мы казалі, што гэтая праца ў працягу тыдня ня можа разьвіць патрэбнага размаху. Мы казалі, што яна разьвінецца і пашырыцца пасьля дырэктывы партыі, што партыя ўжо глыбока за гэтую працу ўзялася. І вось на XV-ай Канфэрэнцыі мы чуем заяву т. Зіноўева, што можна ўжо адзначыць, што партыя сапраўды, сур'ёзна распачала і праводзіць гэтую працу ў галіне эканамічнай дапамогі беднаце, у галіне палітычнай арганізацыі беднаты. Інакш кажучы, гэты момант, які займаў у пляцформе апазіцыі выдатнае месца, зараз,пасьля яе заявы, адкідаецца. Пры гэтым лідэры апазыцыі зусім без патрэбы бяруць такі тон, што апазыцыя ўзьняла пытаньне аб беднаце, а партыя прыняла прапанову апазыцыі. Вы ведаеце з

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы